**23.** Выберыце з дадзеных толькі нескланяльныя назоўнікі.

*1) кашнэ; 2) кафля; 3) калібры; 4) домна; 5) ланч.*

**А)** усе назоўнікі. **Б)** няма такіх назоўнікаў. **В)** 1, 3. **Г)** 2, 4. **Д)** 3, 5.

---

**24.** Суаднясіце прозвішчы вядомых беларускіх мастакоў слова і месца іх нараджэння.

*1) Іван Навуменка; 2) Іван Чыгрынаў; 3) Максім Танк; 4) Віктар Карамазаў.*

*а) горад Чэрыкаў; б) вёска Пількаўшчына; в) горад Васілевічы; г) вёска Вялікі Бор.*

**А)** 1-а, 2-б, 3-в, 4-г. **Б)** 1-б, 2-а, 3-г, 4-в. **В)** 1-б, 2-в, 3-а, 4-г.
**Г)** 1-в, 2-г, 3-б, 4-а. **Д)** 1-г, 2-а, 3-в, 4-б.

---

**25.** Як называецца мастацкі прыём прымяншэння велічыні, сілы прадмета ці з'явы, падзеі?

**А)** гіпербала. **Б)** літота. **В)** адухаўленне. **Г)** параўнанне. **Д)** метафара.

---

**26.** Выберыце з дадзеных прыметнікі, якія супадаюць у значэнні '*які мае адносіны да балота, уласцівы балоту*', але розняцца стылістычна.

*1) балаця́ністы; 2) балаця́ны; 3) бало́тны; 4) бало́цісты.*

**А)** 1, 2. **Б)** 1, 3. **В)** 1, 4. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

---

**27.** У старажытных рымлян назва першага дня месяца была – … .

**А)** нядзеля. **Б)** панядзелак. **В)** календы. **Г)** канікулы. **Д)** адпачынак.

---

**28.** Закончыце выраз.

*Адвербалізацыя – гэта пераход іншых часцін мовы ў … .*

**А)** назоўнікі. **Б)** прыметнікі. **В)** займеннікі. **Г)** прыслоўі. **Д)** дзеясловы.

---

**29.** Выберыце крылатыя выразы, аўтары якіх названы правільна.

*1. "У родным краі ёсць крыніца жывой вады…" (М. Танк).*
*2. "Палеткі мудрасці народаў – кнігі" (Д. Бічэль).*
*3. "Рукапісы не гараць" (М. Булгакаў).*

**А)** усе выразы. **Б)** няма такіх выразаў. **В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 3.

---

**30.** Усе ведаюць беларускую мастачку слова Эдзі Агняцвет. Дарэчы, у свой час псеўданім Агняцвет даў Янка Купала, якому 16-гадовая Эдзі прынесла пачытаць свае вершы. Паэт, калі аддаваў назад творы, сказаў: "*Ты сама, як агняцвет* (так у народзе называлі купальскую кветку)*!*" Якое сапраўднае прозвішча паэткі?

**А)** Аколава. **Б)** Галіноўская. **В)** Каган. **Г)** Арабей. **Д)** Маеўская.

---

Арганізатар гульні-конкурсу «Буслік» –
Грамадскае аб'яднанне «Беларуская асацыяцыя «Конкурс»
220045, г. Мінск, вул. Яна Чачота, 16 тэл. (017) 375 66 17, 375 36 23
e-mail: info@bakonkurs.by https://bakonkurs.by/ https://конкурс.бел/
КОНКУРС
Унітарнае прадпрыемства «Выдавецкі цэнтр БА «Конкурс». Заказ 5. Тыраж 10100 экз. 2021 г.

Гульня-конкурс па беларускай мове і літаратуры

# «БУСЛІК-2021»

*Чацвер, 18 лютага 2021 года*

- працягласць работы над заданнем 1 гадзіна 15 хвілін;
- на кожнае пытанне маецца толькі адзін правільны адказ;
- на старце ўдзельнік атрымлівае авансам 30 балаў;
- кожны правільны адказ адзначаецца трыма, чатырма ці пяццю баламі; колькасць балаў, якія атрымлівае ўдзельнік, адказваючы на пытанне правільна, вызначаецца складанасцю пытання (10 лягчэйшых пытанняў – па 3 балы, 10 найбольш складаных – па 5 балаў, астатнія 10 – па 4 балы); складанасць пытання вызначаецца па колькасці ўдзельнікаў, якія правільна на яго адказалі;
- за няправільны адказ аднімаецца чвэрць балаў, прадугледжаных за дадзенае пытанне, у той час, як не даўшы адказу, удзельнік захоўвае раней набраныя балы;
- максімальная колькасць балаў, якой ацэньваецца заданне конкурсу, – 150, аднак аўтары задання не прадугледжваюць яго поўнага выканання ўдзельнікамі; у заданне гульні-конкурсу ўключаны пытанні, веды пра якія не прадугледжаны школьнай праграмай;
- карыстацца даведнікамі, падручнікамі, слоўнікамі, іншымі пісьмовымі або друкаванымі матэрыяламі, электроннымі сродкамі інфармацыі і сувязі забараняецца; не дазваляецца таксама абменьвацца інфармацыяй з іншымі ўдзельнікамі і задаваць пытанні настаўніку; ручка, чарнавік, картка і заданне – гэта ўсё, што патрэбна мець удзельніку;
- самастойная і сумленная работа над заданнем – галоўнае патрабаванне арганізатараў да ўдзельнікаў конкурсу;
- пасля заканчэння конкурсу лісток з заданнем і чарнавік удзельнік забірае з сабой і захоўвае іх да падвядзення канчатковых вынікаў;
- вынікі ўдзельнікаў размяшчаюцца на сайце https://bakonkurs.by/ праз 1–1,5 месяцы пасля правядзення конкурсу.

---

## Заданне для вучняў 10-11 класаў

**1.** Дадзены ўстойлівыя звароты: *1) гнуць у … пагібелі; 2) сагнаць … патоў; 3) на … словы.* Якія лічэбнікі прапушчаны ў выразах?

*а) два; б) тры; в) чатыры; г) пяць; д) сем.*

**А)** 1-а, 2-б, 3-в. **Б)** 1-б, 2-а, 3-г. **В)** 1-в, 2-г, 3-а. **Г)** 1-д, 2-в, 3-б. **Д)** 1-б, 2-д, 3-а.

---

**2.** Словазлучэнні падзяляюцца на іменныя, дзеяслоўныя, прыслоўныя ў залежнасці ад таго, якой часцінай мовы з'яўляецца галоўнае слова. Выберыце з прапанаваных іменныя словазлучэнні.

*1) мокры ад дажду; 2) першы ад дарогі; 3) засеяны жытам; 4) далёка ў лесе.*

**А)** усе словазлучэнні. **Б)** няма такіх словазлучэнняў. **В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

---

**3.** Якія з наступных функцый выконвае сказ?

*1) камунікатыўную; 2) інфармацыйную; 3) назыўную;*
*4) тэкстаўтваральную; 5) функцыю ўздзеяння.*

**А)** усе дадзеныя функцыі. **Б)** няма такіх функцый. **В)** 1, 2. **Г)** 2, 4. **Д)** 3, 5.

---

**4.** У якім сказе з дадзеных на месцы пропуску коска не ставіцца?

*1. Навокал быў густы травяністы луг_ усыпаны расою.*
*2. Недзе пад поўнач пасыпаў сняжок_ густы і сухі.*
*3. Працяты марозам_ снег скрыпеў пад нагамі.*

**А)** ва ўсіх сказах. **Б)** няма такіх сказаў. **В)** 1. **Г)** 2. **Д)** 3.

**5.** Дадзены словы з польскай мовы: *1) noc; 2) żyć; 3) jeden; 4) ziemia.* Падбярыце беларускія адпаведнікі: *а) адзін; б) жыць; в) ноч; г) зямля.*

**А)** 1-а, 2-б, 3-в, 4-г. **Б)** 1-б, 2-в, 3-г, 4-а. **В)** 1-в, 2-б, 3-а, 4-г.
**Г)** 1-г, 2-а, 3-б, 4-в. **Д)** 1-а, 2-г, 3-в, 4-б.

---

**6.** Вызначце тып дадзенага сказа.

*Ноч прыйшла да зямлі на спатканне, захад скончыў агнём палаць, і дубы ў малочным тумане веліканамі ціха стаяць (У. Караткевіч).*

**А)** просты сказ. **Б)** складаназлучаны сказ.
**В)** складаназалежны сказ. **Г)** бяззлучнікавы складаны сказ.
**Д)** складаны сказ з рознымі відамі сувязі.

---

**7.** Устанавіце адпаведнасць паміж словамі-прафесіяналізмамі і прадстаўнікамі прафесій ці сфер дзейнасці, хто выкарыстоўвае гэтыя словы.

*1) выключыць; 2) ляп; 3) ход канём; 4) задраіць.*
*а) марак; б) электратэхнік; в) журналіст; г) шахматыст.*

**А)** 1-а, 2-б, 3-в, 4-г. **Б)** 1-б, 2-в, 3-г, 4-а. **В)** 1-в, 2-а, 3-б, 4-г.
**Г)** 1-г, 2-б, 3-а, 4-в. **Д)** 1-б, 2-г, 3-в, 4-а.

---

**8.** У якім слове на месцы пропуску напішаце літару ***о***?

*1) св..еасаблівы; 2) н..ваўтарэнне; 3) н..ваеўрапейскі.*

**А)** ва ўсіх словах. **Б)** няма такіх слоў. **В)** у 1. **Г)** у 2. **Д)** у 3.

---

**9.** У якім (ці якіх) з прапанаваных сказаў на месцы пропуску неабходна паставіць коску?

*1. Лезучы ў нерат_ не пройдзеш уперад.*
*2. Ідучы па кладачцы_ на бакі не глядзі.*
*3. Едучы бачком_ ні з кім не зачэпішся.*

**А)** ва ўсіх сказах. **Б)** няма такіх сказаў. **В)** у 1, 3. **Г)** у 2. **Д)** у 3.

---

**10.** Выберыце з дадзеных словазлучэнне, у якім выдзеленыя словы з'яўляюцца амонімамі.

*1) <u>зборка</u> аўтамабіля – <u>зборка</u> на сукенцы; 2) <u>прайшлі</u> гады – <u>прайшлі</u> рабочыя;*
*3) <u>плошча</u> прамавугольніка – <u>плошча</u> ў цэнтры горада.*

**А)** усе словазлучэнні. **Б)** няма такіх словазлучэнняў. **В)** 1. **Г)** 2. **Д)** 3.

---

**11.** У якім (ці якіх) з наступных сказаў на месцы пропуску працяжнік не ставіцца?

*1. Нашы азёры _ вялікія і светлыя.*
*2. Страшэнны штукар і свавольнік _ гэты Нёман.*
*3. Возера ў сонечны дзень _ нібы люстэрка.*

**А)** ва ўсіх сказах. **Б)** няма такіх сказаў. **В)** у 1. **Г)** у 2, 3. **Д)** у 3.

---

**12.** Выберыце словы, у якіх на месцы пропуску напішаце літару ***-ы***.

*1) за..граць; 2) супер..нтэлект; 3) с..граць; 4) з..мправізаваць;*

**А)** усе словы. **Б)** няма такіх слоў. **В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

**13.** Дадзены ўстойлівыя спалучэнні: *1) застаўся як … на мялі; 2) стройны як … ліванскі; 3) махае рукамі як … .* Якія назоўнікі прапушчаны? Падбярыце правільныя варыянты: *а) млын; б) рак; в) кедр.*

**А)** 1-а, 2-б, 3-в. **Б)** 1-а, 2-в, 3-б. **В)** 1-б, 2-а, 3-в.
**Г)** 1-б, 2-в, 3-а. **Д)** 1-в, 2-а, 3-б.

---

**14.** Вы ведаеце раздзелы мовы: *1) фанетыка; 2) лексіка; 3) марфалогія; 4) сінтаксіс.* Вызначце адпаведнасць з вывучаемымі ў іх паняццямі: *а) службовыя часціны мовы; б) дыялектызмы; в) злучнік; г) азванчэнне.*

**А)** 1-а, 2-б, 3-в, 4-г. **Б)** 1-б, 2-в, 3-г, 4-а. **В)** 1-в, 2-а, 3-б, 4-г.
**Г)** 1-г, 2-б, 3-а, 4-в. **Д)** 1-а, 2-г, 3-в, 4-б.

---

**15.** Вызначце правільна напісаныя лічэбнікі.

*1) дзесяцімільённы; 2) тышча сто дваццаць;*
*3) пяцьдзясят; 4) шасцьюдзесяцью; 5) абедзьве.*

**А)** усе лічэбнікі. **Б)** няма такіх лічэбнікаў. **В)** 1, 3. **Г)** 2, 4. **Д)** 3, 5.

---

**16.** Вызначце, у якіх словазлучэннях прыназоўнікі выражаюць аб'ектныя адносіны.

*1) сукенка з шоўку; 2) трымацца за парэнчы;*
*3) адносіцца да прыроды; 4) дом на два паверхі.*

**А)** ва ўсіх словазлучэннях. **Б)** няма такіх словазлучэнняў. **В)** у 1, 2. **Г)** у 2, 3. **Д)** у 3, 4.

---

**17.** Колькі слоў з [ш] у народным выслоўі?

*Горш, калі баішся: і ліха не мінеш, і надрыжышся.*

**А)** 0. **Б)** 1. **В)** 2. **Г)** 3. **Д)** 4.

---

**18.** Дадзены словы: *1) капуста; 2) касьба; 3) шчасце; 4) сціхаюць.* Вызначце словы, у якіх усе зычныя гукі глухія.

**А)** усе словы. **Б)** няма такіх слоў. **В)** 1, 3. **Г)** 2, 4. **Д)** 3, 4.

---

**19.** Вымаўленне якіх слоў з дадзеных не супадае з напісаннем?

*1) праменьчык; 2) на кладцы; 3) зжаліцца.*

**А)** усіх слоў. **Б)** няма такіх слоў. **В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 3.

---

**20.** Дабрачынная дзейнасць, аказанне дапамогі бедным і тым, хто мае ў чым-небудзь патрэбу, іх апекаванне – гэта … .

**А)** філантрóпія. **Б)** філатэлія. **В)** філігрань. **Г)** філафанія. **Д)** філуменія.

---

**21.** Выберыце патрэбныя варыянты. *Паводле сферы ўжывання этыкетныя формулы падзяляюцца на … .*

*1) нейтральныя; 2) афіцыйныя; 3) размоўныя.*

**А)** усе варыянты. **Б)** няма такіх варыянтаў. **В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 3.

---

**22.** Вызначце з прапанаваных слова(-ы), утвораныя прыставачна-суфіксальным спосабам.

*1) скульптар; 2) выпраўленне; 3) прывабны.*

**А)** усе словы. **Б)** няма такіх слоў. **В)** 1. **Г)** 2, 3. **Д)** 3.